Дапамагчы педагогам стаць даследчыкамі

Такой бачыць сваю місію — кансультанта інавацыйнага праекта — дацэнт кафедры асноў спецыяльнай педагогікі і псіхалогіі БДПУ імя Максіма Танка кандыдат педагагічных навук Генадзь Іванавіч Якубель. Магчыма, вопыт работы ў якасці кансультанта ў Генадзя Іванавіча, у параўнанні з іншымі кансультантамі, і не такі вялікі — пяць гадоў, але затое інавацыйны праект, у якім ён прымаў самы непасрэдны ўдзел, быў прызнаны экспертамі адным з лепшых у рэспубліцы, ды і педагогі-інаватары аб сваім кансультанце адзываюцца толькі станоўча. Менавіта таму сёння Генадзя Іванавіча запрашаюць падзяліцца вопытам на рэспубліканскіх семінарах па арганізацыі інавацыйнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі.

Пра свае інавацыйныя праекты, умовы іх эфектыўнай рэалізацыі і формы ўзаемадзеяння з удзельнікамі Г.І.Якубель пагадзіўся расказаць і нашым чытачам.



Пасля заканчэння біялагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Г.І.Якубель выкладаў геаграфію ў сярэдняй школе Гродна, працаваў выкладчыкам сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і метадыстам Ашмянскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа. У 2002 годзе Генадзь Іванавіч абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Арганізацыя эўрыстычнага навучання вучняў старшых класаў у сучаснай школе". З 2006 года працуе ў БДПУ імя Максіма Танка: спачатку на кафедры педагогікі, а цяпер на кафедры асноў спецыяльнай педагогікі і псіхалогіі. Галіна навуковых інтарэсаў — дыдактыка сучаснай школы. Дысцыпліны, якія выкладае, — "Педагогіка дзяцінства (сучасная школа: тэарэтычны аспект) і "Педагогіка дзяцінства (педагагічныя сістэмы і тэхналогіі: практычны аспект)".

— Генадзь Іванавіч, якой вы бачыце сваю ролю ў якасці кансультанта інавацыйнага праекта?

— Сучасны настаўнік павінен быць даследчыкам як у сваім прадмеце, так і ў педагогіцы, методыцы навучання і выхавання. Інавацыйная работа якраз дазваляе ўключыць педагога ў такую дзейнасць. Таму сэнс сваёй работы ў якасці кансультанта інавацыйнага праекта я бачу перш за ўсё ў тым, каб дапамагчы настаўнікам (і не толькі вопытным, але і маладым) уключыцца ў даследчую работу, захапіцца ёю, перажыць першы станоўчы вопыт і ў выніку стаць творчымі настаўнікамі.

Узаемадзеянне з настаўнікамі, інавацыйная работа дазваляюць мне быць у курсе ўсяго, што адбываецца ў школе. Да таго ж частку матэрыялу, які я атрымліваю падчас інавацыйнай работы, магу выкарыстоўваць у сваёй рабоце ва ўніверсітэце. Лічу, дарэчы, што выкладчыкам УВА, якія выкладаюць педагагічныя і метадычныя дысцыпліны, неабходны рэгулярныя стажыроўкі ў школах, каледжах, ПТНУ ў якасці настаўніка, класнага кіраўніка.

— Узгадайце, калі ласка, як вы ўпершыню сталі кансультантам інавацыйнага праекта. Гэта была ваша ініцыятыва ці вам хтосьці прапанаваў?

— Афіцыйна я займаюся навуковым кансультаваннем пяць гадоў, а неафіцыйна яшчэ больш — з таго часу, калі працаваў у ашмянскім каледжы. Мне гэтая работа заўсёды падабалася.

Пяць гадоў назад Мікалай Іванавіч Запрудскі прапанаваў мне стаць кансультантам інавацыйнага праекта па тэме маёй дысертацыі. З Мікалаем Іванавічам мы былі знаёмы з часу абароны маёй дысертацыі, дзе ён выступаў адным з апанентаў. Першы праект пад назвай "Укараненне мадэлі эўрыстычнага навучання ў адукацыйны працэс сучаснай гімназіі" быў запушчаны ў 2008 годзе і працягваўся два гады. У яго рабоце прымалі ўдзел тры гімназіі: Слоніма, Рагачова і Лепеля. Лепельская гімназія, дарэчы, была самая маладая. Работа прайшла дастаткова паспяхова: нас адзначылі, і мы ўвайшлі ў шасцёрку лепшых інавацыйных праектаў рэспублікі.

З 2011 года я з'яўляюся кансультантам чарговага праекта пад назвай "Укараненне мадэлі фарміравання абагульненых вучэбных уменняў навучэнцаў сродкамі міжпрадметнай інтэграцыі". Праект разлічаны на тры гады, у ім прымаюць удзел чатыры ўстановы адукацыі: сярэдняя школы № 1 Салігорска, № 10 Светлагорска, № 3 Дзятлава і гімназія імя І.М.Ерашова Лепеля. Сутнасць праекта — у выкарыстанні сучасных метадаў і форм міжпрадметнай інтэграцыі, на аснове якой фарміруюцца агульнавучэбныя ўменні і навыкі як малодшых школьнікаў, так і навучэнцаў сярэдняга і старшага звяна.

На мой погляд, абагульненыя вучэбныя ўменні і навыкі разумовай працы — вострая праблема сучаснай сярэдняй і вышэйшай школы. Сучасны школьнік, як і выпускнік школы, студэнт, нядрэнна ўмее шукаць інфармацыю ў розных крыніцах, а вось яе апрацоўка (напрыклад, камбінаванне інфармацыі з трох-чатырох крыніц, яе абагульненне і падача адным блокам і г.д.) у іх можа выклікаць цяжкасці. Гэта недапрацоўка школы.

— З якіх крыніц вы, на пачатку сваёй работы ў якасці кансультанта, чэрпалі інфармацыю, якім павінен быць кансультант, якія яго правы і абавязкі?

— У Інструкцыі па арганізацыі эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь толькі ў самым агульным выглядзе вызначаны правы і абавязкі кансультанта. Маімі "крыніцамі" былі старэйшыя калегі, а менавіта М.І.Запрудскі і Г.І.Дабрынеўская. У гэтай справе яны мае настаўнікі!

— На ваш погляд, ці трэба праводзіць спецыяльныя вучэбныя семінары для кансультантаў, якія толькі пачынаюць займацца гэтай справай?

— Такія семінары праводзяцца на базе Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Я, у прыватнасці, у свой час удзельнічаў ва ўстановачным семінары для пачынаючых кансультантаў у якасці слухача, а ў гэтым годзе ўжо двойчы выступаў на семінарах. Сапраўды, кансультантам патрэбны сустрэчы, на якіх можна было б абмяняцца вопытам, думкамі.

— Як вы лічыце, кансультантам інавацыйнага праекта можа быць толькі спецыяліст, які мае вучоную ступень ці вучонае званне?

— Неабавязкова. Гэта можа быць і чалавек, які не мае вучонага звання, але рэальна валодае пэўнай тэхналогіяй, мае вялікі вопыт эксперыментальнай і інавацыйнай работы.

— А ці можа быць кансультантам чалавек, які не мае глыбокіх спецыяльных ведаў па тэме інавацыйнай пляцоўкі?

— Мне здаецца, што можа, але пры ўмове, што сам кансультант гэтай тэмай "гарыць" і хоча яе вывучаць паралельна са сваім падапечнымі і нават апярэджваючы іх. Так атрымалася з маёй другой тэмай. Да пачатку праекта ў мяне былі толькі дзве невялікія публікацыі па тэме інавацыі, аднак у галаве нараджалася нямала думак і таму хацелася ўзяцца за яе распрацоўку.

— Па якіх правілах вы будуеце свае ўзаемаадносіны з педагогамі-інаватарамі?

— Тут, на мой погляд, важна пазбегнуць дзвюх крайнасцей — закінутасці і гіперапекі. Гэтак жа, як і ў выхаванні дзяцей. Прадстаўляючы педагогам-інаватарам пэўную самастойнасць, усё ж трэба самому актыўна праяўляць супрацоўніцтва, асабліва на ключавых стадыях, калі адзін этап работы над праектам змяняецца другім (тое, што М.І.Запрудскі называе рэперными кропкамі).

Задумваючыся над формулай поспеху інавацыйнай работы, я прыйшоў да высновы, што, па-першае, кансультант павінен глыбока прадумаць і прапанаваць педагогам (або разам з імі ў эўрыстычным пошуку выпрацаваць) унутраную логіку рэалізацыі праекта. Знешняя (арганізацыйная) логіка прапісана ў інструкцыі, таму ўсе добра ведаюць, як праект запускаецца, калі пішуцца справаздачы, як афармляюцца дзённікі і г.д. Знешняя логіка ад тэмы не залежыць, а ўнутраная логіка звязана якраз з тэмай і зместам праекта. Яна павінна прадугледжваць пэўнае разгортванне ідэі. Не скажу за ўсе інавацыйныя праекты, а ў дыдактычных і, магчыма, выхаваўчых можа быць такая логіка: ад сітуацыі да працэсу, ад працэсу да сістэмы. Дапусцім, укараняецца некаторая мадэль альбо тэхналогія. Настаўнікам і навучэнцам, якія задзейнічаны ў праекце, прапануецца прайсці праз пэўныя вучэбна-пазнавальныя, выхаваўчыя сітуацыі. Такім чынам, яны атрымліваюць першы станоўчы вопыт і адначасова ў іх узнікаюць першыя сур'ёзныя пытанні. Гэта сітуацыйны ўзровень. Затым усё гэта рэалізоўваецца на вялікім этапе вучэбна-выхаваўчага працэсу, які завяршаецца падвядзеннем вынікаў (працэсуальны ўзровень). Потым выбудоўваецца больш-менш завершаная сістэма работы, якая ўключае розныя ступені навучання (малодшая, сярэдняя, старшая), розныя цыклы вучэбных прадметаў (гуманітарных, прыродазнаўчых і інш.), розныя аспекты работы (дыдактычны, прадметна-метадычны, выхаваўчы, дыягнастычны, кіраўніцкі і інш.), і з'яўляецца галоўны прадукт інавацыйнага праекта — метадычныя рэкамендацыі. Гэта ўжо сістэмны ўзровень. Вось па такой логіцы я будаваў свой першы праект, такой логікі мы прытрымліваемся і зараз.

— Ці часты вы госць у навучальных установах, з якімі працуеце па інавацыйным праекце? Як арганізоўваеце кансультаванне педагогаў-інаватараў, вучэбныя семінары для іх?

— На этапе запуску праекта неабходна добрая ўстановачная лекцыя (з нагляднасцю, мультымедыйным забеспячэннем) не толькі для вузкай групы будучых педагогаў-інаватараў, а для ўсяго калектыву школы. Трэба, каб уся школа была ў курсе таго, што робіцца ў яе сценах, тым больш што затым усе педагогі будуць дапамагаць інавацыйнай групе ў правядзенні дыягностыкі, зборы даных і г.д. Неабходна, каб людзі паверылі, што ідэя, якая рэалізоўваецца ў праекце, жыццёвая, а не выдуманая. Вядомы спецыяліст па праблемах інавацый Хрысце Ангелоўскі пісаў, што добрае метадалагічнае забеспячэнне інавацыі з'яўляецца адным з фактараў яе паспяховай рэалізацыі. Пасля ўстановачнай лекцыі кожны педагог вырашае для сябе, будзе ён удзельнічаць у праекце ці не. І толькі пасля гэтага канчаткова фарміруецца інавацыйная група. Лічу, што калі такая першая маштабная сустрэча не адбудзецца, то можна будзе сумняваць ў далейшай эфектыўнасці работы.

Другая сустрэча праводзіцца, напрыклад, на пераходзе ад інфармацыйнага этапу да дыягностыка-прагнастычнага. Не на ўсіх факультэтах педагагічнага ўніверсітэта чытаецца спецкурс "Асновы педагагічнай дыягностыкі", і не ўсе настаўнікі валодаюць пытаннямі правядзення педагагічнай дыягностыкі, таму неабходна навучыць іх яе праводзіць. Трэба даць ім установу, методыкі, абмеркаваць, што мы будзем даследаваць. Для таго, напрыклад, каб прадыягнаставаць узровень развіцця творчых здольнасцей дзяцей, псіхолагі выкарыстоўваюць стандартызаваныя методыкі: тэсты Гілфарда, Торанса і інш. А педагог для гэтай жа мэты выкарыстоўвае вучэбна-дыягнастычныя задачы, назірае за бягучай работай навучэнца, гутарыць з ім, стварае пэўныя педагагічныя сітуацыі. Напрыклад, па нашым сённяшнім праекце настаўнікі бралі інтэрв'ю ў выпускнікоў школ, студэнтаў, пыталіся, з якімі цяжкасцямі тыя сутыкнуліся ва ўстанове вышэйшай адукацыі, якіх уменняў і навыкаў ім не хапае для паспяховага навучання, што б яны параілі сённяшнім старшакласнікам і інш.

Пасля такой сустрэчы пачынаецца дыстанцыйная работа з педагогамі ўжо пры дапамозе сучасных сродкаў інфармацыі.

Затым на педагагічным або метадычным савеце ў школе абагульняюцца першыя напрацоўкі. Добра, калі кансультант зможа на гэтым мерапрыемстве пабываць, у іншым выпадку ён абавязкова павінен пазнаёміцца з матэрыяламі.

Трэцяя важная сустрэча з інавацыйнымі калектывамі адбываецца на стадыі выбару тэм індывідуальных распрацовак педагогаў. І тут нельга абысціся толькі прадстаўленнем спіса тэм. Трэба з кожным педагогам пагутарыць. Я прапаноўваю тэму настаўніку, але і ён можа прыйсці са сваёй ідэяй, якую мы затым разам падкарэкціруем. Пры выбары тэмы для педагога трэба ўлічыць прадмет, які ён выкладае, стаж работы, навуковыя і метадычныя інтарэсы, творчыя здольнасці, і нават хобі.

Чацвёрты вузлавы момант (прыкладна люты — сакавік) — заканчэнне дыягнастычна-прагнастычнага этапу. Гэты этап заканчваецца пэўным мерапрыемствам, якое мы назвалі педагагічнымі чытаннямі, таксама можа быць невялікая канферэнцыя. Чытанні звычайна праходзяць на базе адной са школ, якія ўдзельнічаюць у праекце. Падчас іх настаўнікі абменьваюцца напрацоўкамі, задумкамі, пытаннямі, устанаўліваюцца кантакты паміж калектывамі школ, кіраўнікі праекта разам з кансультантам праводзяць дыягностыку, як настаўнікі валодаюць тэмай праекта.

— Атрымліваецца, што для кансультанта самы актыўны перыяд — першы год работы над інавацыяй?

— Так. Ад першага года многае залежыць.

У самым пачатку педагогі пад кіраўніцтвам кансультанта набываюць вопыт самастойнай работы, а потым могуць самастойна многае рабіць. Другі і трэці год кансультант курыруе вялікія вучэбна-выхаваўчыя і метадычныя мерапрыемствы, міжшкольныя сустрэчы (якія павінны праводзіцца мінімум раз у год), працягвае кансультацыі, рэдагуе матэрыялы ўдзельнікаў праекта.

У рабоце з інавацыйнымі калектывамі я прытрымліваюся правіла: яны павінны бачыць не толькі мяне, але і іншых даследчыкаў, спецыялістаў, якія займаюцца гэтай ці падобнымі праблемамі. Гэта важна, таму што на пэўным этапе (у канцы першага года работы над інавацыяй) ва ўдзельнікаў інавацыйнага праекта ўзнікае некаторая маральная стомленасць, і для таго, каб ажывіць абстаноўку, ім карысна паўзаемадзейнічаць з іншымі даследчыкамі. Для такіх сустрэч можна выкарыстоўваць базу АПА ці ІПКіП БДПУ імя Максіма Танка. Напрыклад, у маім першым праекце па эўрыстычным навучанні такімі даследчыкамі выступілі мае настаўнікі М.І.Запрудскі і Г.І.Дабрынеўская. А ў другім праекце спецыялістамі-экспертамі былі Т.Я.Цітавец, дацэнт БДПУ імя Максіма Танка і І.У.Шасцітка, дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі спецыяльстаў адукацыі ІПКіП БДПУ імя Максіма Танка, спецыяліст і аўтар дысертацыі па фарміраванні рэфлексіўных уменняў, якія з'яўляюцца часткай агульнавучэбных.

— Пасля заканчэння работы праекта ўдзельнікі інавацыйнай пляцоўкі павінны напісаць метадычныя рэкамендацыі. Як вядома, гэта становіцца сапраўднай праблемай для многіх. На вашу думку, падрыхтоўка метадычных рэкамендацый — гэта непасрэдны абавязак навуковага кансультанта?

— Складальнікам метадычных рэкамендацый можа быць кансультант або калектыў аўтараў.

— А як было ў вас?

— Я збіраў матэрыял і складаў рэкамендацыі сам. Сёння з імі можна пазнаёміцца на сайце АПА. Нашы метадычныя рэкамендацыі па першым праекце па эўрыстычным навучанні складаюць 115 старонак. З іх 40 старонак — гэта мая праца (тэарэтычная частка), а астатнія — вялікі дадатак, у якім сабраны лепшыя распрацоўкі ўрокаў, творчыя заданні, умовы эўрыстычнай алімпіяды і г. д. настаўнікаў розных школ.

— Генадзь Іванавіч, а вам цікава ведаць, ці запатрабаваны вашы напрацоўкі па інавацыйным праекце, ці выкарыстоўваюць іх у сваёй рабоце педагогі школ рэспублікі (акрамя тых, хто ўдзельнічаў у інавацыйным праекце)?

— Безумоўна. На гэты час нашы педагогі-інаватары дзяліцца сваім вопытам праз публікацыі ў педагагічных СМІ, на канферэнцыях і семінарах. Будзем спадзявацца, што нашы ідэі запатрабаваны і прынясуць карысць педагогам і дзецям!

Мне здаецца, што вельмі важна, каб на базе школ, якія паспяхова закончылі інавацыйны праект, былі створаны кансультацыйныя цэнтры, пэўныя лабараторыі, дзе педагогі, якія ўдзельнічалі ў інавацыйнай рабоце, маглі далей працаваць па тэме, а таксама вучыць сваіх калег з іншых устаноў адукацыі.

— Дзякуй, Генадзь Іванавіч, за размову. Поспеху вам у інавацыйнай дзейнасці!

Гутарыла
Святлана КІРСАНАВА.
kirsanava@nn-press.by